Цана асобнага нумару 20 гр. Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

ДОЛЯ ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12 m. 6). Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрасу 30 гр.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок петыту ў 1 шпальту.

№ 3 Вільня, Серада 8-га жніўня 1928 г Год 1

Апошнія польскія лёты.

Шпальты ўсіх буржуазных польскіх газэт запоўнены цяпер весткамі аб лётах польскіх лётнікаў праз вялікія прасторы. Яны поўны шуму, пыхі, радасьці, надзеі, веры ў свае сілы. Цяпер ужо вядома, што апошні грандыёзны лёт польскіх лётнікаў Ідзікоўскага і Кубалі праз Атлянтыцкі акіян кончыўся поўнай няўдачай (катастрофай), такой-жа няўдачай кончыўся папярэдні польскі лёт, менш грандыёзны, але ўсё-ж даволі вялікі — з Варшавы да Багдаду. Газэты поўны вестак, частку з якіх даём у гэтым нумары, аб катастрофах лётнікаў падчас практыкаваньняў і меншых пералётаў.

Можна разглядаць усе лёты, як пэўнага роду спорт (гульню, выробляючую зрушачнасьць) і расцэньваць іх, як гаворыцца, з чыста маральнага пункту гледжаньня. У такім выпадку няўдачы апошніх лётаў мусяць збудзіць у нас чуцьцё спагады і жалю да людзкіх няшчасьцяў.

Аднак, ня з мэтай спорту рабіліся апошнія лёты. Спорт гэты быў асобнага роду. У самым груньце гэтыя лёты маюць аграмаднае грамадзкае значэньне. Не дарма-ж шпальты буржуазных польскіх газэт перапоўнены толькі захватам аб гэтых лётах. Дзеля гэтага, пакідаючы спагаду спагадай, мусім таксама падыйсьці, як кажуць, да грунту рэчы.

Скажам адразу, што апошнія лёты—гэта лёты маладога польскага імпэрыялізму, які, толькі што аперыўшыся, лезе навыперадкі з старымі сваімі калегамі. Гэта—калі хочаце — спорт, але бессэнсоўны спорт за славу, за пяршынства ў сьвеце.

Невялікі факт, калі глядзець з агульна-сусьветнага пункту гледжаньня—паветраная катастрофа некалькіх аэрапляаў, але ён раскрывае адну з падставовых засадаў капіталізму. Гэта засада — *канкурэнцыя*. Ня быць узаду за другімі, быць першым усюды, за якую-б ня было цану—вось засада капіталістычнага сьвету. Гэта засада, што праўда, вырасла на грунце больш жыцьцёвым, як пустая забава ў славу і пяршынства, яна вырасла з барацьбы за рынкі збыту паасобных нацыянальных капіталізмаў, з барацьбы за калёніі, ці з Імпэрыялізму. Але экспансія (імкненьне да пашырэньня) наўзавады перад другімі абхапляе ня толькі бок беспасярэдня датычны эканамічнага жыцьця, — яна праймае і душу ўсяго капіталістычнага грамадзянства, перакідаецца, як кажуць, на грамадзкую псыхолёгію. Тады канкурэнцыя пераходзіць у сьляпы нацыянальны шавінізм, у непатрэбную нікому нацыянальную пыху і гонар.

Малады польскі імпэрыялізм пачаў з другога боку. Як відаць, яшчэ не пазабытыя старыя магнацка-шляхоцкія традыцыі пыхі—не давалі спаць новачэснаму, ужо буржуазнаму ці абуржуазьненаму польскаму грамадзянству. Падобна італьянскаму пышнаму генэралу Нобіле—ён пачаў з хваста, каб адцягнуць хіба ўвагу шырокіх колаў працоўнага народу ад яго штодзённай барацьбы за вызваленьне з нявыноснага палажэньня, каб паказаць і ім, зацікавіць і іх сваімі „пасьпехамі на міжнародным полі“.

Ці патрэбна гэта каму? Ці ёсьць карысьць працоўнаму народу з пустой спавы, калі-б навет лёты і ўдаліся?

Ясна, што—не!

Але мала таго. Няўдачы не заўсёды бываюць выпадковымі. Сталасьць лётных катастрофаў таксама зварачвае на сябе агульную ўвагу і раскрывае другую старонку маладога імпэрыялізму — гэта непадгатаванасьць, а разам дзяціную веру „ў геній народу“. Гэта адбіцьцё другой падставовай засады капіталізму—*анархіі*, неўпарадкаванасьці, у даным выпадку таксама перанесенае на псыхолёгічнае поле гіпэртрофічнай нацыянальнай амбіцыі (самалюбства). У такім выпадку лёты наўзавады маладога польскага імпэрыялізму выклікаюць толькі абурэньне.

Мы пэўныя, што ўсе працоўныя места і вёскі ўсяе Польшы ня нойдуць іншых слоў да падгатавальнікаў лёту, да шавіністычнага грамадзянства, для якога пыха вышэй ўсяго—як толькі слоў абурэньня і большай сьвядомасьці сваіх асобных інтарэсаў ад яго. Няхай гэтыя лёты будуць яшчэ лішняй навукай і беларускім працоўным гушчам, навукай аб канкурэнцыйным і анархічным характары буржуазнага грамадзянства, навукай выробленьня свайго працоўнага ідэалу, вольнага ад сьляпое пыхі буржуазіі, а аснованай толькі на жыцьцёвай барацьбе за сваё існаваньне, за свой добрабыт, за сваю лепшую, сьветлую будучыню.

Новая—„Вялікая Сірыя“.

(Нацыянальнае аб'яднаньне Сірыі пад францускім „мандатам“).

Яшчэ нядаўна ўся Сірыя, як ведама, была—побач з усім „арабскім сьветам“, ахоплена агнём паўстаньняў, якія перайшлі ў запраўдную вайну з францускай уладай — за поўнае вызваленьне і незалежнасьць краю. Як ведама, у Сірыі гаспадаруе „з мандату (даручэньня) Лігі Нацыяў“ француская ўлада, прадстаўнік якой—няздольны, нетактоўны, ваяўнічы генарал—сваімі жорсткімі мерамі—толькі падліваў масла ў гэны пажар. Сьцяг ваенных паражэньняў францускіх войскаў у Сірыі—адначасна з вайной у Марокко—змусілі францускі ўрад — адклікаць свайго дрэннага „генаральнага камісара“ дый паслаць туды аднаго з сваіх найспрытнейшых палітыкаў. Яго тактыка новага камісара, а галоўнае — паражэньне марокскага паўстаньня прыпыніла і ў Сірыі—можа, да новай „хвалі агульна-арабскага руху“—паўстанчую акцыю. З фактам францускага панаваньня—дзякуючы больш спрытным і лагодным мерам францускага імпэрыялізму—Сірыя неяк пагадзілася. Найбольш крайнія павадыры незалежніцкага руху адыйшлі неяк у кут; на сцэну выйшлі больш умеркаваныя, практычныя, згодніцкія, буржуазна-творчыя элемэнты, якія згадзіліся працаваць поруч з францускімі акупантамі з ласкі Лігі Нацыяў.

Адной з праяваў гэтай працы зьяўляецца апрацаваньне для ўсей Сірыі, аб'яднанай у адзіную дзяржаву, супольнай канстытуцыі. Падобна да працы, якую распачалі цяпер англійцы ў Індыі, і ў Сірыі — у яе сталіцы Дамаску—засядае „канстытуцыйная камісія“, ці ўстаноўчы сойм, якая і мае мэтай выканаць гэтую працу. Справа ў тым, што Сірыя дагэтуль складалася з 5 зусім асобных дзяржаўных адзінак краю: Алаўітаў, Сірыі, Александрэцкага санджаку, краю Джэбель Друз і Рэспублікі Ліванскай. Дамаская „Канстытуцыйная Камісія“—з „прадстаўнікоў (?) усіх краёў—згодна высказаліся за іх аб'яднаньне. Але аказалася, што ў Ліванскай Рэспублікі ёсьць сярод рэспубліканскага грамадзянства вострыя засьцярогі проці такога аб'яднаньня — **без папярэдняга вырашэньня прышлага дзяржаўнага ладу аб'яднанай сірыйскай дзяржавы.**—Пэўне-ж Ліванскія рэспубліканцы ня хочуць — шляхом аб'яднаньня — папасьці пад панаваньне аднаго з „каралёў“, якога францускія рэспубліканскія імпэрыялісты пэўне-ж пасадзяць на сірыйскі пасад — англійскім звычаем,—каб лягчэй было трымаць руку на жыцьці аб'яднанай сірыйскай дзяржавы. У выніку гэтага — паміж сірыйскай і ліванскай прэсай пачалася вострая палеміка. Ліванская прэса трэбуе, каб справа прышлага дзяржаўнага ладу „Вялікай Сірыі“ была вырашана безадкладна і згары—шляхам паразуменьня Лівану з Сірыяй, як найважнейшых складовых частак прышлай дзяржавы; сірыйская прэса—наадварот—прапануе—адлажыць справу на-пасьля ды вырашыць яе агульным плебісцытам (усенародным галасаваньнем) — усіх грамадзян новастворанага гаспадарства „Вялікай Сірыі“.

Як вырашыцца справа, няведама. Адзначаем цяпер толькі спробу народзінаў новай магамэтанскай, арабскай дзяржавы, поўнае вызваленьне якой з-пад улады францускіх імпэрыялістаў—пэўне-ж толькі пытаньне часу.

Але—пэўне ж — новай сірыйскай дзяржаве трэба будзе прайсьці даўгі камяністы шлях, пакуль зьдзейсьняцца лятуценьні сірыйскіх незалежнікаў. Бо-ж і Францыя — яшчэ даволі магутная дзяржава, каб утрымаць—шляхом ваеннай акупацыі—па „мандату Лігі“—сваю ўладу ў краі, а галоўнае—усе вялікія імпэрыялістычныя дзяржавы Эўропы добра паразумеліся ў апошнія часы ў справах супольнай сваей каляніяльнай палітыкі навакол Сярэдземнага мора. Апошнім выразам гэтага паразуменьня зьяўляецца падпісаньне Танжэрскага Трактату ўсімі 4-ма гэтымі дзяржавамі, маючымі „асаблівыя інтарэсы“ на афрыканскім беразе гэтага мора. Запраўды-ж—прайшлі ўжо (да часу!) тыя, яшчэ такія нядаўнія часы, калі Францыя цешылася з паражэньняў Гішпаніі ў яе Марокко, Італія трыўмфавала з банкрутаваньня францускага „прэсьціжу“ у францускім Марокко, а Англія—пасылала аружжа паўстанцам у абодвух Марокко... Цяпер усе гэтыя каляніяльныя дзяржавы зразумелі, чым пагражае ім усім і кожнай паасобку гэтая „добра-суседзкая“ палітыка канкуруючых імпэрыялізмаў, і — дайшлі ў ей да поўнага — прынамсь на якісь час—паразуменьня.

Быў час, яшчэ нядаўна, калі Францыя гатова была падтрымаць у Лізе Нацыяў скаргу Эгіпту на англійскае „мандатаваньне“ ў Эгіпце, а Англія — на францускае ў Сірыі! Цяпер нічога падобнага няма. — Усе імпэрыялістычныя дзяржавы — супольным фронтам закрапляюць свае каляніяльныя пазіцыі ў Паўночнай Афрыцы. Францыя і Італія забясьпечылі Англіі „вольную руку“ ў Эгіпце, што адразу адбілася на ходзе падзеяў у гэтым краі, якому Англія ў 1922 г. „падаравала незалежнасьць“, здаецца,—больш дзеля таго, каб... звольніць сябе ад абавязкаў здаваць справаздачу Лізе Народаў, як яе „мандатара“... Украпіўшыся міжнародавым паразуменьнем, англійская ўлада ў Эгіпце шпаркім ходам справакавала здарэньні, у выніку якіх маем ужо—спробу дыктатуры, забіцьцё дыктатара (?) і пагрозу чарговай ваеннай расправы з бунтуючым „незалежным“ краем... Можна спадзявацца, што нешта падобнае рыхтуецца і ў „францускай“ Сірыі... Што робіцца ў італьянскіх валадзеньнях у Афрыцы, аб гэтым можна толькі дагадвацца: „нацыянальнаму гонару“ збэшчаных фашыстаў у глыбіні Афрыканскіх іх калёніяў адчынілася шырокае поле. А весткі адтуль каменным мурам адбівае назад шчыльная ваенная цэнзура...

Такім чынам—афрыканскі арабскі сьвет павінен пережыць пэўны пэрыяд так-званай „стабілізацыі імпэрыялізму“, які пэўне-ж выкарыстае для свайго культурна-гаспадарчага ўздыму, зьбіраючы новыя сілы на далейшую барацьбу за незалежнасьць—у час наступнага крызісу, выкліканага няўхільнай канкурэнцыяй сваіх валадароў-імпэрыялістаў.

—·—

А што робіцца цяпер у „англійскай“ Арабіі, выразна кажа апошняя тэлеграма з Каіру — аб новай вайне, ці прасьцей: бойні, якую распачалі англійцы ў Іемене.—Англійскія аэрапляны дожджам сыплюць бомбы на месты паўдзённага Іемену, падтрымліваючы ваенную акцыю англійскіх войскаў у Адэне.

Як ведама, амаль ня ўся Арабія—выключана Англіяй з-пад трактату Кэллога, як „сфэра выключна англійскіх інтарэсаў“, маючая...—„унутрана-англійскі“, а ня міжнародавы характар (?!).

Такім чынам—калі ў Эгіпце, Арабіі, Сірыі, ці дзе інш, пачнецца ваенная расправа, дык гэта зусім ня будзе вайна, кажуць англійскія імпэрыялісты, спыненьне якой прадбачыць Трактат Кэллога!!

„Стабілізацыя імпэрыялізму“, як бачым, знаходзіць сабе добрага прыяцеля і саюзьніка—у шляхотным апостале амэрыканскага пацыфізму!..

Але-ж ёсьць і новыя, памысныя для арабскага мусульманскага сьвету, палітычныя факты апошніх часоў, у значнай меры зьмяняючы на добра агульныя міжнародавыя абставіны для таго вялізарнага пасa гэтых народаў, якія цягнецца ўдоўж Паўночнай Афрыкі—ад Атлянтыцкага акіяну да Арабіі.

Мы маем на думцы новы факт паяўленьне на сьвеце новай незалежнай Афганскай дзярж. і — кансалідацыю ў патройны саюз Турцыі, Пэрсыі і Афганістану,—трох-мусульманскіх дзяржаваў, незалежнасьць якіх мае ўжо сільныя падставы і бязумоўна прызнана вялікімі дзяржавамі. Гэты нядаўна дакананы саюз мае мэтай кансалідацыю ня толькі культурных і гаспадарчых, але і ваенных сілаў гэтых магамэтанскіх дзяржаваў, блізкіх па веры ўсяму арабскаму сьвету.

Уплывы гэтага новага азіяцкага „патройнага саюзу“ мусульманскіх дзяржаваў мы хутка пачуем у сусьветнай палітыцы. — З іх Пэрсія ўжо ўваходзіць у склад Лігі Нацыяў; Турцыя і Афганістан, трэба думаць, (хаця-б—на злосьць Радам)—будуць пэўне-ж уцягнуты таксама ў Лігу, дзе—пэўне-ж выступяць абаронцамі сваіх аднаверцаў у калёніях і „паўкалёніях“ („мандатавых“) ад крыўдаў з боку вялікіх дзяржаваў...

Палякі аб сваім гандлі.

Пішучы аб польскім гандлі, 219 нумар „Rzeczypospolitej“ падае некаторыя заметкі з брашуры дырэктара Дзяржаўнага Экспартовага Інстытуту, М. Турскага.

Гэтыя заметкі і падаём тут нашым чытачом, каб наглядна пераканаліся, хоць з гэтага, няведама якога працэнту фактаў аб польскім гандлі, ці ён запраўды так добра выглядае, а разам з гандлем і ўся гаспадарка Польшчы, як аб гэтым распісваецца санацыйная прэса.

Адразу аўтар цьвердзіць, што перашкодай разьвіцьця польскага экспорту (гандлю) зьяўляецца гультайства і снобізм (хвароба на „панства) польскіх купцоў, — што польскія купцы ня любяць дастаўляць самі беспасярэдна спажыўцу свой тавар, а ім неабходны „пахцяж і фактар“ г. ё. перакупшчык. Адгэтуль, кажа аўтар, зьяўляецца і вялікае пасярэдніцтва Нямеччыны, аб якім даюць проста зьдзіўляючае паняцьце цыфры, усталеныя польскім консульствам у Гамбурзе.

За гэтым Турскі зьвяртае ўвагу на „памылкі“ ў паняцьці аб польскім заграначным гандлі, націскаючы, што немагчыма спадзявацца актыўнасьці гандлю з прычыны вывозу збожжа, бо, кажа, лішку можна было-бы даняць толькі пры вельмі добрых ураджаях. Ня можна, кажа, такжа лічыць і на вываз дзерава, якога незадоўга можа забракнуць і ў краі (Польшчы).

З географічных абставінаў перашкодай разьвіцьця польскага вывазу ёсьць перасычэньне суседзяў Польшчы таварамі, што выклікала шуканьня новых, ня суседніх беспасярэдна з Польшчай рынкаў. Але тут перашкаджае фінансавая слабасьць польскага экспорту, змушаючы яго шукаць як найдагаднейшых крэдытавых рынкаў, што ставіць яго ў вялікую залежнасьць ад розных „канюнктураў“, хоць-бы і ад таго, што 90 прац. польскага вывазу йдзе праз Нямеччыну, пераплачваючы, як кажа аўтар, 5 разоў акцыз.

Вельмі цікавыя ўвагі пасьвячае аўтар і арганізацыі прадукцыі і перaробкі лёну і гутніцкіх вырабаў, занядбаных шкадліва для Польшчы, якія, нажаль, вымененая газэта не падае.

Але і гэтага хіба хопіць, каб мець больш-менш прадстаўленьне аб польскім гандлі і гаспадарцы наагул, калі да гэтага яшчэ дадаць, што, паводле ўрадавай статыстыкі, за апошнія 15 месяцаў Польшча страціла на замежным гандлі адзін мільярд злотых.

—·—

Варта паглядзець, ці ёсьць у Польшчы надзея (матка глупых), як пішуць людзі, на хуткую (ці ня хуткую) паправу захістаўшайся сваей гаспадаркі, дзякуючы ўнутранай прадукцыі.

Першай магчымай надзеяй—была-б надзея на збожжа. Але ўсім хіба вядома, які цяпер у Польшчы ўраджай: дзе збожжа ня

вымерзла, там выпрэла, дзе ня выпрэла, там навальніца выбіла, вымыла, а аб астатках і град не паляніўся парупіцца.

Такая надзея ў Польшчы на збожжа — покарм для людзей, — такая-ж самая і на покарм для скаціны -- сена. Аб сене прэса пiшае, што яго ў гэтым годзе станоўча замала, каб сяляне (і навет двары) маглі пракарміць сваю скаціну. Значыць, трэба спадзявацца прадажы апошняй сялянскай каровкі. А прадасьць селянін апошнюю карову, то, ня гледзячы на іншыя няшчасьці, гэтым самым ён пазбаўляецца і будучага ўраджаю — бо-ж ведама, што сялянская зямля — лёгенька, як пясочак — бяз гною ня родзіць. А няма ў сялян скаціны — няма гною — няма і хлеба, няма і бульбы.

Надзеі на лес — ня лепшыя, бо спыніўся вываз дзерава ў Англію (Rzeczpospolita № 220), галоўнага спажыўца беларускага лесу. А вываз дзерава чароднаму спажыўцу па Англіі — Нямеччыне вельмі значна аслабеў, дзякуючы адмове ўраду Нямеччыны будаўляных крэдытаў. З гэтай прычыны ў II квартале г. году Польшча вывезла ў Нямеччыну толькі 30 прац. прызначанага Польшчай ў сьнежні мінулага году ліку дзерава.

На ўнутраным рынку устрыманьне будаўляных крэдытаў Банкам Краёвага Гаспадарства адбілася таксама ад'емна на галінах польскага гандлю дзеравам.

Вось становішча гаспадаркі Польшчы.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Няўдача польскага лёту праз Атлянтык.

Як падаюць апошнія экстраныя выпускі газэтаў—знамяніты лёт польскіх лётчыкаў Ідзікоўскага і Кубалі на аэрапляне „Маршадак Пілсудскі" цераз Атлянтыцкі Акіян, аб якім (лёце) было столькі рэклямы і шуму і весткамі, аб якім былі запоўнены апошнія дні ўсе польскія газэты—закончыўся катастрофай. Аэраплян упаў у мора. Лётчыкі асталіся жывымі і выратаваны нямецкім караблём.

Катастрофа лёту да Багдаду

Апошнімі днямі на вялікім трохматаровым аэрапляне выляцелі ў вялікае падарожжа тры польскія лётнікі: пар. Шаляс, пар. Каліня і сэрж. Клосінэк. Мелі яны адбыць шлях Варшава-Багдад (у Азіі)—Каір (сталіца Эгіпту ў Афрыцы). Даляцеўшы да Багдаду, у часе спусканьня здарылася катастрофа, у якой забіты пар. Шаляс. Астальныя лётнікі вышлі з катастрофы цэлымі.

Лётніцкія катастрофы ў краі.

Апошнімі днямі ўваколіцах Лодзі ўпаў польскі вайсковы аэраплян. Два лётнікі — капт. Сьмерчак і капітан Шнайдэр — забіты. Аэраплян пакрышаны. 3 г. жніўня ў ваколіцах Кракава ўпаў польскі вайсковы аэраплян, бышы пад кіраўніцтвам капітана Швэйкоўскага. Кап. Швэйкоўскі забіты на мейсцы, апарат пакрышаны.

Мусім адзначыць, што катастрофы польскай паветранай флёты здараюцца вельмі часта, апублікаваньню якіх прэсай горача працівіцца некаторая з польскай прэсы, як напр. „K. Wil." № 175 ў стацьці „Nieułatwiać pracy szpiegom".

Урадоўцы хочуць падбаўкі.

Як інфармуе варшаўская прэса, саюзы ўрадоўцаў радзяцца аб вядзеньні акцыі за падбаўку пэнсіі дзяржаўным урадоўцам. Саюзы намерваюцца прадставіць восеньню ў Сойм уласны ўнёсак падбаўкі з адначасным указаньнем крыніцаў пакрыцьця яе коштаў.

З Польшчы выяжджаюць.

Па статыстыцы эміграцыйнага Ураду Польшчы, у красавіку г. году з Польшчы выэміґравала (выехала) агулам 31,260 чалавек. З гэтага: ў эўрапэйскія дзяржавы 23,921 чалавек, у іншых 7,339 чалавек.

Аб чым сьведчыць такая вялікая эміграцыя на невялікую Польшчу, ня трэба хіба і казаць, як ня трэба казаць і тое, аб чым сьведчыць лік 23,921 чалавек, выехаўшых у эўрапэйскія дзяржавы — аб тым гэта сьведчыць, што ня толькі ў не ваяваўшай Амэрыцы лепей жывецца, як у Польшчы, але і ваяваўшай ня менш Польшчы Эўропе.

Безрабоцьце.

Па статыстычных даных у мінулым тыдні ў Варшаве зарэгістравана 8,520 безработных, у тым ліку 2,950 умысловых працаўнікоў.

Як падае статыстыка, на абшарах Сьлёнскага ваяводзтва ад 18 да 25 м. ліпня было зарэгістравана 31,525 безработных.

Палітычнае забойства.

На адной з вуліц Варшавы знойдзены труп некага Мэера Газэнфуса, забіта, паводле варшаўскай прэсы, з палітычных прычынаў.

Канфіската.

Нядовячы сканфіскавана выходзячая ў Варшаве польская часопісь „Rzeczpospolita" (№ 221). Прычына канфіскаты — артыкул „Таемніца кабінэту цэнзуры" ў Галоўнай Пошце.

Будуюць...

Як паведамляе прэса, Міністэрства Справядлівасьці маецца ў хуткім часе будаваць у Гдыні акружны суд, а пры судзе—ведама што—вастрог...

Сьпірытус даражэе.

Дырэкцыя Дзяржаўнага Сьпірытусовага Манаполю падвысіла ад 1-га жніўня цану сьпірытусу па 70 грошаў на літры.

Вялізарны град.

Надовячы, у ваколіцах Ярамаўя і Бярозава (Галіцыя) праняслася вялікая бура з градам, вялічынёю з курынае яйцо. Апрача розных матэр'яльных шкодаў, бура зьнішчыла больш як на мільён злотых збожжа.

Дакладна шкоды яшчэ не палічаны.

Арышт камуністаў.

У Катавіцах арыштаваны (паводле польскай прэсы) быццам „правадыры" акружных камітэтаў: Вінцук Алёлкоўскі, Абрам Каган (з Лодзі), Станіслаў Бучынскі (з Варшавы), Антон Камінскі (з Горнай-Дамбровы) і Паўла Молянда (з Крулеўскай Гуты).

Пры рэвізіі быццам знойдзена многа агітацыйнага „матэр'ялу", інструкцый К. Л. П., абежнікаў, улетак і г. д.

Заграніцай.

Агітацыя ў заграчнічнай буржуазнай прэсе за запрашэньне СССР да ўчасьця ў Трактаце Кэллога

Цэлы шэраг газэтаў у Нямеччыне, Англіі, Амэрыцы і інш. дзяржаваў заклікае сусьветную дыпляматыю да запрашэньня Радавага ўраду да супольнага з іншымі закладчыкамі „Трактату Кэллога" падпісаньня яго ў Парыжу. Але, як ведама, англійскі ўрад рашуча заявіў у сваіх засьцярогах да Трактату, што Англія нічога ня мае проці пазьнейшага далучэньня Радаў да Трактату, пэўне-ж — без усялякіх засьцярогаў з іх боку!—але Англія — проці таго, каб СССР быў запрошаны ў лік першых закладчыкаў Трактату!..

Падпісаньне трактату паміж Кітаем і Амэрыкай.

Майстроўскім крокам новага кітайскага ўраду зьявілася заключэньне ўмовы з Амэрыканскімі Штатамі. Нямепш спрытным крокам было заключэньне першага трактату з новым урадам вызвольнага Кітаю і з боку амэрыканскай дыпляматыі. Кітаю трактат дае вялізарнай вагі козыр у далейшых яго перагаворах з іншымі дзяржавамі, у якіх новы кітайскі ўрад будзе выступаць, як прызнаны ўжо магутнай Амэрыкай. Амэрыканскай дыпляматыі, як з зайздрасьцяй сцьвярджае афіцыёз англійскага ўраду, „Таймс", асабліва йшло аб тое, каб—Амэрыка першай прызнала новы кітайскі ўрад. „І гэтае мэты дапялі Штаты, сільна прыхіліўшы гэтым да сябе адроджаны Кітай—тады, як іншыя імпэрыялістычныя дзяржавы—у выніку сваей хістаючайся палітыкі (?)—сьцягнулі на сябе толькі недаверра, калі ня што горшае, — з боку 400-мільённага кітайскага народу". Цяпер дык „шкадуюць"!.. Пэўне-ж гэты закід ня можа адносіцца да бліжэйшага заходняга суседа Кітаю — СССР, які заўсёды шчыра і рэальна падтрымліваў імкненьне кітайскага народу да вызваленьня.

„Таймс" з сумам расказвае цяпер, у якім сэкрэце падрыхтоўваўся гэты кітайска-амэрыканскі трактат. Кітайскі міністар заграм. спраў выехаў з Нанкіну сэкрэтна ў Пэкін, дзе — у такім-жа сэкрэтным паразуменьні з амэрыканскім паслом апрацаваў тэкст трактату.

Цяпер, маючы афіцыяльнае падтрыманьне з боку Амэрыкі, кітайскі ўрад можа значна спакайней адносіцца да ўсіх чарговых ваенных правакацыяў з боку Японіі. З свайго боку і Амэрыка мае—на выпадак канфлікту з Японіяй,—добрага таварыша саюзьніка ў асобе кітайскага народу...

Японія і Кітай.

Апублікаваньне кітайска-амэрыканскага трактату адразу зьмяніла адносіны японскага ўраду да Кітаю. Новая нота Японіі да Нанкінскага ўраду мае ўжо зусім іншы лагодны — тон. Нота кажа, што японскі ўрад гатовы ўвайсьці ў перагаворы з Нанкінскім урадам — у справе перагляду японска-кітайскіх існуючых трактатаў, толькі Японія ня можа згадзіцца прынцыпова на тое, каб новы кітайскі ўрад лічыў гэтыя трактаты ўжо зьліквідаванымі яго аднабокай заявай — у першай яго ноце.

Зварот у польска-літоўскіх перагаворах.

Польскі ўрад выслаў Літве адказ на апошнюю ноту яе ўраду, прапануючую прадаўжэньне перагавораў у Кэнігсбэргу ў канцы жніўня.

Польскі ўрад згаджаецца на прадаўжэньне перагавораў, але дадае, што 15 — 25 жніўня польскі міністар Залескі ня будзе магчы асабіста прыняць учасьце ў перагаворах.

Нямецкая прэса даведалася, быццам польскі ўрад мае запрапанаваць літоўскаму прэм'еру перанесьці канчальныя перагаворы з Кэнігсбэргу ў Жэнэву — на час перад самым зьездам Рады Лігі Нацыяў. Тады мін. Залескі прыедзе раней у Жэнэву — проста з Парыжу—пасьля падпісаньня Трактату Келлога!

Нямецкая прэса, камэнтуючы гэтую вестку, кажа, што польскі ўрад пэўне-ж хоча тым зрабіць, каб польска-літоўскія перагаворы вясьці на віду ўсяго сьвету — у абставінах больш карысных для Польшчы.

„Харвацкі контр-парлямант у Загрэбе".

Адначасна з адчыненьнем парляманту ў Белградзе — харвацкія пасла сабраліся на сваю нараду — у гмаху былога (за аўстрыякамі) харвацкага краёвага Сойму. Пасьля нарады гэтага „харвацкага парляманту" была выдана адозва да ўсяго народу, у якой „дэмакратычная сялянская коаліцыя" заяўляе, што сялянская коаліцыя ў Югаславіі створана дзеля таго, каб вясьці легальную, але тым нямепш рашучую барацьбу проці пануючага ў краі ўрадавага ладу, якія давёў да паступаньня 20 чэрвеня (крывавых стрэлаў у парляманьце). Але ж гэтая ўрадавая сыстэма робіць ужо немагчымай легальную барацьбу ў парляманьце. Дык цяпер сялянская коаліцыя пакінула парлямант, трэбуючы новых выбараў, якія правёў-бы нэйтральны (непалітычны) ўрад. Але дамаганьне гэта ня было прынята, а Белградзкі парлямант сабраўся дый працуе сабе далей. Дык сялянская коаліцыя заяўляе гэтым згары, што ўсялякія пастановы гэтага парляманту, а асабліва-ж усялякія пастановы ў галіне фінансавай, — ня маюць ні якай сілы для тых краёў Югаславіі, якія не належалі да даўнейшай — даваеннай Сэрбіі...

Далей адозва кажа, што выпадкі 20-га чэрвеня маральна зьнішчожылі пануючы яшчэ фактычна сэрбскі нацыяналістычна-цэнтралістычны рэжым у краі, канец якога— толькі пытаньне часу.

Укапы адозва кажа, што канчальныя пастановы ў справе далейшай тактыкі сялянскай коаліцыі будуць прыняты — пасьля выздараўленьня Радзіча.

Такім чынам, упорства сэрбскай эндэцыі ізноў выклікала завастрэньне апазіцыйнай— сацыяльнай і нацыянальнай — барацьбы ў Югаславіі.

Гэта адозва выклікала вялікае і сумнае ўражаньне ў Белградзкіх кіруючых колах. Асаблівую трывогу ў Белградзе выклікаў той факт, што — у загрэбскім „контр-парляманьце, апрача харвацкіх паслоў, прымае ўчасьце і ўся група паслоў сэрбскай незалежнай дэмакратычнай партыі", якая, як ведама, таксама ўваходзіць у склад апазіцыі.

Але белградзкія палітыкі пацяшаюць сябе тым, што пастановы Белградзкага парляманту маюць „законную сілу" і бяз учасьця апазіцыі, а так-жа тым, што акцыя апазіцыйнага сялянства—„ня мае намеру разьбіцьця на кавалкі Югаслаўскай дзяржавы"... Бо ж у сваей прамове ў Загрэбскім „парляманьце" павадыр сэрбскіх „незалежных дэмакратаў" Прыбічэвіч, — пратэстуючы проці „сэрбскай прэтэнзіі на выключнае панаваньне ў Югаславіі", выразна засьцярагаўся проці нарушэньня з боку апазіцыі—дзяржаўнага адзінства Югаславіі. Але-ж пэўна—тактыка сэрбскіх нацыяналістаў можа ізноў давясьці харватаў і да ўваскрашэньня тых аддзяленчых імкненьняў, якіх яны пазбавіліся самі за апошнія гады.

Склад новага югаслаўскага ўраду.

Прэм'ер новага ўраду Югаславіі — пас. Карошэц ёсьць адначасна, як і ў папярэднім габінэце,—мін. унутраных спраў; мін. заграчнічных спраў астаецца той-жа Марынковіч; ваенным міністрам ёсьць няўдалы прэм'ер ген. Гадзіч.

Урад мае ў пачатку жніўня склікаць на кароткую сэсію парлямант—пэўне-ж для ратыфікацыі трактату ў Нэттуно і зацьвярджаньня заграчнічнай пазыкі—у чым пэўне-ж апазіцыя прымаць учасьця ня будзе. Пасьля гэтага парлямант будзе распушчаны на вакацыі, з якіх ужо больш не зьбярэцца — бо ўрад мае ўканцы быццам споўніць дамаганьне апазіцыі расьпісаць новыя выбары.

Сэнсацыйная нарада ў Карлсбадзе

У Карлавых Варах (былы аўстрыяцкі Карлсбад) у Чэхаславаччыне ўжо зьехаліся прадстаўнікі—Нямеччыны і Малай Антанты—у справе нейкіх тайных нарадаў, аб якіх аднак-жа ўсебачучая прэса даносіць ужо сэнсацыйныя весткі.

Штрэзэман ужо прыехаў і быў прыняты прыбыўшым туды-ж „на курацыю" прэзыдэнтам Масарыкам, які прыгэтым выразіў пажаданьне, каб—у магчыма хутчэйшым часе паміж Бэнэшам і Штрэзэманам распачаліся нарады ў важнай справе сярэдняй Эўропы, а таксама і больш блізкіх стасункаў між Чэхаславаччынай і Нямеччынай.

Канфэрэнцыя гэта мае адбыцца ў бліжэйшых днях, бо-ж зараз жа мае прыехаць у Карлсбад мін. Бэнэш. Але — што яшчэ больш трывожыць францускую ды „французячую" дыпляматыю, гэта—тое, што ў той-жа Карлсбад у той самы час — на тую-ж „курацыю" маюць зьехацца і іншыя мін. заграчнічных спраў Малай Антанты дый яшчэ і Аўстрыі! Такім чынам ясна, што справа ідзе запраўды-ж, як адкрыта амаль-што заявіў Масарык,—аб праект стварэньня сярэдня эўрапэйскага аб'яднаньня дзяржаваў (уніі) — у складзе Малай Антанты, Аўстрыі і Нямеччыны. На закіды францускай прэсы чэха-славацкая адказвае, што Чэхаславаччына павінна была паклапаціцца аб сваім лёсе дый паразумецца з Нямеччынай — калі пачула аб усё цясьнейшым збліжэньні Францыі з Нямеччынай... Як ведама, мін. Бэнэш—адзін з найспрытнейшых палітыкаў і дыпляматаў Эўропы, маючы і свае думкі і свой самастойны пачын...

Паразуменьне Італіі з Югаславіяй.

Значнае злагоджаньне ўзаемных адносінаў паміж Югаславіяй і Італіяй выразілася ў чарговым кроку паразуменьня ў справе прадаўжэньня „трактату прыязьні", якога тэрмін скончыўся 28 ліпня. Абодва ўрады згадзіліся маўкліва прадоўжыць трактат, пачакаўшы на мамэнт, калі ўнутраныя стасункі Югаславіі неяк дайдуць да парадку. Як можна зразумець, паразуменьне Югаслаўскага ўраду з Італіяй у значнай меры адбілася няўступлівасьцяй яго ўва ўнутраным споры з апазіцыяй.

Кангрэс II Інтэрнацыяналу.

У канцы жніўня мае ў Брусэлі (Бэльгія) адбыцца чарговы кангрэс II Інтэрнацыяналу.

З падслуханага.

(Маленькі фельетон).

На бліжэйшай сэсіі Лігі Народаў Францыя ўнясе прапазыку аб наданьні Польшчы канцэсіяў на некаторыя калёніі, якія да вайны належалі да немцаў.

(З польскіх газэт).

Сяджу на Замкавай гары ў Вільні. Побач мяне сядзяць нейкія паны і голасна дыскутуюць. Прыслухваюся, — гутарка ідзе аб прышлых калёніях Польшчы.

— О, каб нам калёніі, — мы тагды маглі-б папярэдзіць немцаў!

— Глупства — немцаў, мы і Англіі ня ўступілі-б!

— Толькі ліха іх ведае, дзе гэта ёсьць тыя калёніі?

— Ну, як дзе?! — там, дзе перад вайной былі нямецкія...

— Гм... перад вайной. — Ліха яго цяпер успомніць...

— Географію вучыў?

— Слабавата...

— Пры чым тут географія! Мы павінны дамагацца права самім выбіраць калёніі там, дзе мы хочам...

— Напрыклад у Афганістане—калі што якое ў Варшаве, дык свайго караля Амавуляха мелі-б...

— Я-б хацеў лепш у Мэксыцы, — мы-б тых бязбожнікаў-мэксыканцаў зараз на... Лукішкі!... Паказалі-б ім, дзе ракі зімуюць. Чыталі вы, як яны там каталікоў перасьледуюць, няйначай бальшавікі якія.

— Эх, каб дзе бязлюдную выспу далі!— Вогненую зямлю якую, ці што...

— А што табе з тэй выспы?

— Як што? Я-б туды арыштантаў ссылаў. Напрыклад, засудзілі каго на дванаццаць гадоў ці болей, — я-б яго на выспу!— нашто дарэмна польскі хлеб будзе есьці...

— Рацыя, пане, рацыя! Трэба будзе адносны мэморыял да Варшавы напісаць.

— А я артыкул у газэту чыркну. Жарточкі, столькі вязьняў у нашых вастрогах сядзіць, а на кожнага вязьня, як пісалі газэты, 900 злотых у год патрэбна! Толькі зьлічыць агулам, дык валасы дубам стануць, — сказаў пан і мацнуў за сваю лысую галаву.

І доўга пацяшаліся паны, што напалі на шчасьлівую думку. Твары іх расчырваneліся, вочы заблішчэлі ад радасьц. Сьмяюцца, шлёпаюць сябе па лысінах і ўсё гутараць і гутараць...

— ...А „Грамаду" ўсю туды вышлем. Зловім дзе грамадзістага, зараз яго за каршэнь і на выспу, — хай зямлю капае, або што іншага робіць, — досыць хлеб наш дарэмна есьці!

— Дый наагул беларусаў туды. Хай сабе там свае гурткі, школы адчыняюць, а тут нечага выдумляць...

— Толькі „Спадара" сабе пакінем,—без яго нам, як бяз рук...

— Так, пане, так, — *жэчэвіста* праўда!

Змоўклі паны. Абярнуліся налева, глядзяць. Абярнуўся і я. Бачу, паноў з дваццаць пад гару лезуць. Змарыліся. Сапуць, крэкчуць, хусткамі лысіны выціраюць. Больш пузатыя. Апрануты багата, па спартоваму. Гэта — „выцечка" з „Велькопольскі". Нехта наперадзі ў чорным водзіць іх, паказвае рукамі і гутарыць:

— Гэта — вежа Гэдыміна, гэта — руіны старага замчышча, тут — магіла паўстанцаў, а там... „нашэ *старэ польске Вільно*". Тут польская культура праменавала на ўсе ўсходнія землі. Тут „*мешкалі крулёве польсцы*". Тут польскія касьцёлы, тут польскія школы. Тут „*пшэважа польскі жывёл*". Тут народ гавора толькі папольску, тут жывуць „*самі поляцы*" і гэтак далей, і далей...

Адзін пан глянуў у кніжачку і пытаецца:

— А дзе ж літвіны і беларусы жывуць?

— Жывуць... жывуць, але іх вельмі мала, ну, некалькі дзесяткаў, можа больш. Элемэнт гэта — больш наплывовы, нятутэйшы. Ніякай культуры яны ня маюць. Няма іх тут ні тэатраў, ні школаў, ні літэратуры, а... навт ня варта аб іх гаварыць.

І зноў пачаў іх праваднік вадзіць іх па гары, паясьняючы: польскі, польскае, польскімі, папольску...

Знудзіла мяне. Пабег я з гары і з нудаў выпіў паўнюткі сыфон содавай вады.

Дык вось, як знаёмяць прыбыўшых з „старапольскай Вільняй".

Я. Чуткі.

налу—з учасьцем польскіх сацыялістаў (пэпэсаў). Нібы на гэтым кангрэсе мае разглядацца справа будучага ладу ў Польшчы. Ці асьмеляцца толькі на гэта лёкайскія пэпэсы?

Водгукі ўсе-нямецкіх маніфэстацыяў у Вене.

Прэсавая бура, паднятая ў „вэрсальскім сьвеце“ венскай маніфэстацыяй на карысьць злучэньня Аўстрыі з Нямеччынай, усё ня можа супакоіцца. Венскія газэты ўважна зьмяшчаюць на сваіх старонках усе варожыя і прыхільныя галасы прэсы ўсяго сьвету. Ведамы дэмакратычны орган у Вене, „Новая Вольная Прэса“ усьцяж бароніць права Аўстрыі на далучэньне да Нямеччыны. Адзін з „пунктаў Вільсона“, які казаў аб праве самаазначэньня народаў, прадбачыць ня толькі права да незалежнасьці народаў, але пэўне-ж і права незалежнага краю на вольную адмову ад незалежнасьці, калі ён бачыць сваю долю ў злучэньні з іншай дзяржавай.

Падаражэньне грошаў у Амэрыцы.

Амэрыканскі Фэдэральны Банк падняў разьмер працэнту (на пазыкі ў ім)—з 4,5 на 5 проц. Гэта значыць, што ў Амэрыцы значна падаражэлі грошы, патрэбныя для розных капітальных выдаткаў у краі. А гэта значыць, што менш амэрыканскай гатоўкі будзе ісьці на эўрапэйскія рынкі ды ўлівацца ў прамысловасьць Эўропы, якой і без таго востра не хапае сваіх капіталаў. А гэта мае няўхільна выклікаць агульнае прыпыненьне разбудовы і разьвіцьця эканамічнага жыцьця наагул у Эўропе. Асабліва адчуваюць гэтае ўздаражэньне грошаў у Амэрыцы ў Нямеччыне, якая не раўнуючы больш за ўсіх дзяржаваў у Эўропе карыстаецца амэрыканскім крэдытам. На бэрлінскай біржы загад Фэдэральнага Банку выклікаў запраўдную паніку.

У справе „Трактату Кэллога“.

Кэллог напэўна прыедзе ў Парыж.

27 сьнежня мае быць падпісаны так званы „Трактат Кэллога“. Дык прэса ўсяго сьвету прысьвячае гэтай справе шмат увагі.

Частка амэрыканскай прэсы, якая настроена проці палітыкі Кэллога, піша, быццам амэрыканскі міністар мае яшчэ час і ахвоту адмовіцца ад падарожы ў Парыж — на падпісаньне Трактату. Бо-ж Кэллог быццам баіцца, што францускія кіруючыя колы захочуць скарыстаць з пабыту амэрыканскага дыплёмата ў Парыжу, каб зрабіць на яго націск у справе саюзьніцкіх даўгоў Амэрыцы і зьвязаных з ей справах нямецкіх адшкадаваньняў. Але нямецкая прэса цьвердзіць, што гэта—хлусьня варожай Кэллогу прэсы, якая гэтымі чуткамі хоча пансаваць працу Кэллога ў Амэрыцы і ў Парыжу. Бо-ж—цяпер, калі ўжо да ўсіх міністраў высланы — пэўне-ж пасьля папярэдняй дыплёматычнай перапіскі—афіцыяльныя запросіны ў Парыж, ня можа быць ужо мовы аб адмове ад падарожы з боку Кэллога.

Кампанія нямецкіх нацыяналістаў проці Трактату Кэллога.

У зьвязку з афіцыяльным запрашэньнем Штрэзэмана ў Парыж — на падпісаньне Трактату Кэллога—нямецкая нацыяналістычная прэса распачала вострую кампанію проці Трактату, дый проці сучаснага нямецкага ўраду.

Газэты пішуць, што візыта нямецкага міністра ў Парыж цяпер—у час, калі над вялікай нямецкай ракой—Рэйнам—стаіць француская акупацыйная войска, гэта-ж ганьба для нямецкага народу! Што-ж датычыць самага Трактату, дык гэта—простая „мышалоўка“, куды Штрэзэман дазволіў злавіць Нямеччыну. Бо-ж — падпісаньне бяз усякіх засьцярогаў гэтага Трактату азначае, паводле нацыяналістычнай прэсы — выручэньне з нямецкага боку ўсялякага перагляду існуючых Трактату.

Цікаўная дыскусія ў справе трактату ў англійскім парляманьце.

У часе дыскусіі ў англійскім парляманьце 30 ліпня—ў справе Трактату Кэллога—выступіў Лёйд Джордж, які востра крытыкаваў тыя засьцярогі, якія зроблены да Трактату англійскім і францускім, а за імі і іншымі (польскім, чэха-славацкім і т. д.) ўрадамі. „Усе гэтыя засьцярогі, казаў Л.-Джордж, робяць немагчымым дакананьне адной з найбольш неабходных і важных для сусьветнага міру рэчы: перагляду Трактатаў. Побач з тым, Л. Джордж востра крытыкаваў з тэго-ж пункту гледжаньня ўтрываленьня міру—усе тыя ваенныя трактаты, якімі — побач з Вэрсальскім—загарантавана нятыкальнасьць існуючага тэрытарыяльнага ладу ў Эўропе, цяжарнага магчымасьцямі ваеннага канфлікту.

Лёйд-Джорджу адказваў Чэмбэрлен, які бараніў—і засьцярогі, эўрапэйскіх дзяржаваў да Трактату Кэллога і сыстэму існуючых трактатаў, — даказваючы іх „выключна абаронны характэр“. Чэмбэрлен паказаў, што—Трактат Кэллога і сыстэма эўрапэйскіх трактатаў—зусім розныя рэчы: калі перастае дзеяць Трактат Кэллога, тады пачынаюць дзеяць абаронныя трактаты, напрыклад—трактат француска-польскі, і наадварот.

На гэта Л.-Джордж адказаў, што гэтыя абаронныя трактаты, гарантуючыя сучасныя граніцы, нажаль бароняць і ўсе тыя крыўды, якія прычынены пераможаным, а перадусім—Нямеччыне, несправядлівым мірам, дый з якімі нямецкі народ проста ня можа паміріцца. Добра для Польшчы, на карысьць якой галоўным чынам зроблена крыўда Нямеччыне, „бараніць існуючы лад“. Польшча, як „шчасьлівы валадар спорнай маемасьці“, запраўды ж ня мае прычынаў для нападу на Нямеччыну. Але ўсё гэта зусім не гарантуе міру. А новы Трактат Кэллога, па думцы Л.-Джорджа, — яшчэ больш цяжкім робіць той перагляд эўрапэйскіх трактатаў і граніцаў, які адзін толькі можа забясьпечыць трываласьць запраўднага міру — на падставе больш справядлівага тэрытарыяльнага ладу ў Эўропе.

Чаму Францыя згадзілася на Трактат Кэллога.

Як ведама, сьпярша Францыя рашуча адкінула праект Кэллога, тэбававушага выручэньня цалком усялякай вайны. З свайго боку, і сам Кэллог рашуча адмовіўся запрапанаваць дзяржавам трактат, у якім ня будзе вырачэньня ўсялякай вайны, а будуць засьцярогі адносна да вайны „абароннай“, як трэбавала Францыя. Але „дыплёматычная штука „Брыяна зрабіла тое, што ўрэшце сам Кэллог чорным па беламу напісаў, што дазвол абароннай вайны зусім не пярэчыць трактату, аб забароне ўсялякай вайны (!?)... — Дый што, „кожная дзяржава пакідае назаўсёды сабе, як неадэбральнае права, рашэньне аб тым, у які мамэнт акалічнасьці змушаюць яе хапіцца вайны, як спосабу самаабароны“...

Вось дык „Трактат Вечнага Міру“!... — Да першай вайны, — „да першай косьці“!... Запраўды-ж навет людаедзкі Вэрсальскі Трактат. з яго дадаткам—статутам Лігі Нацыяў,— не пайшоў так далёка—ў „ваеннай вольнасьці рук“, пакінутай дзяржавам, як гэтыя тлумачэньні Кэллога да яго „Міравога Трактату“... Бо-ж — навет Статут Лігі выразна забараняе сябрам-дзяржавам самастойна дэцыдаваць ваенную акцыю, не спрабаваўшы сьпярша ўсіх тых шляхоў яе папярэджэньня, якія прадбачаны ў статуце Лігі.

Трактат Кэллога будзе падпісаны 27 жніўня ў Парыжу.

З Парыжу паведамляюць, што 26 ліпня Кэллогу і міністрам загран. спраў розных іншых дзяржаваў француcкі ўрад разаслаў запрашэньні—прыехаць у Парыж на 27 жніўня—для падпісаньня „проці—ваеннага Трактату“. Трактат маюць падпісаць — ад імя сваіх дзяржаваў—Кэллог, Чэмбэрлен, Брыян, Штрэзэман, Бэнэш, Залескі, Гюіманс (Бэльгія), японскі пасол у Парыжу і італьянскі віцэ-міністар загр. спраў Гранд замест Мусоліні, які не паедзе у Парыж. Чаму вестка з Парыжу ня кажа аб рэшце запрошаных быццам Кэллогам дзяржаваў Эўропы, няведама.— Ці-ж—запраўды перамагла думка Брыяна, каб закладчыкамі трактату зьявіліся толькі „лёкарнскія“ дзяржавы, а рэшта—далучылася-б пасьля?!

З Т-ва Бел. Школы.

Акружны зьезд Т-ва Беларускае Школы ў Горадні.

12 ліпня с. г. адбыліся перавыбары Горадзенскай Акружнай Управы Т-ва Бел. Шк. На зьезд прыбылі прадстаўнікі ад гурткоў Т-ва Бел. Шк. Горадзенскага павету. На тварах прыбыўшых ясна можна было прачытаць адбітак тых прыкрых перажываньняў, якія пакінулі па сабе выбары да Сойму. Нічым не заслужаная няміласьць з боку мясцовых уладаў, як гаць стрымала воду, стрымала росквіт культурна-адраджэнскае працы ў Горадзеншчыне. Гэтыя поўныя веры, поўныя гарачай энэргіі маладыя барацьбіты на ніве культурнай ня ўпалі духам, не паддаліся адчаю, што можна было бачыць з далейшага цягу зьезду, наадварот—несправядлівае тасаваньне рэпрэсіяў дадало сілаў у змаганьні за родную асьвету; сталёвым гартам узмоцніла грудзі змагароў, цьверда верачых, што які-б ня быў цярністы гэты сьвяты шлях да шчасьця. да лепшае будучыні, мы будзем ісьці па ім, выбівацца з адвечнае цямноты да сонца, да сьвятлом зьзяючых прамяністых зораў шчасьця.

Зьезд адчыніў Старшыня Т-ва А. Уласаў, які, прывітаўшы ад імя Галоўнае Управы прысутных, даў поўную характарыстыку агульнае культурна-асьветнае справы, як у замежных дзяржавах, так і ў нас, у Заходняй Беларусі.

Ад Горадзенскай Акружнай Управы даклад аб працы Т-ва робіць гр. Сяўрук. Досіць яскрава высьветліўшы, як арганізацыйную, так і культурна-асьветную працу гурткоў, грам. Сяўрук зазначыў, што ёсьць шмат перашкодаў, па той ці іншай прычыне на шляху да поўнага развою нашай арганізацыі. Ня можна не зрабіць закіду дакладчыку, які як былы Старшыня Горадзенскае Акруж. Управы, робіць памылковы вывад, што трудна вясьці ў такіх рамках працу, калі людзі, паміма справы культурнай, цікавяцца яшчэ шмат чым... Абставіны жыцьця, гэты бурлівы вадаварот яго, дае права кожнаму грамадзяніну мець пэўную орыентацыю ў-ва ўсебаковых паглядах на жыцьцё і ня можна ніколі абмяжоўваць свой сьветапагляд выключна ў межах культурнага усьведамленьня.

Далей па чарзе ідуць даклады з мейсц. Выносіцца агульнае уражаньне, як цьверда з непарушнаю вераю ў свае сілы гэтыя сыны вёскі ідуць да свае сьвятое мэты, ня гледзячы на ўсе перашкоды, на ўсе прыкрасьці на гэтым ідэйным шляху, якія асабліва далі сябе балюча адчуць у апошнія пасьлявыбарчае часы. Пасьля дакладаў з мейсц даецца слова інструктару ад Галоўнае Управы Т-ва Бел. Шк. грам. Шырме. Колькі бадзёрнасьці, колькі заахвочваньня да працы чуецца ў гэтах шчырых словах перадавога змагара на ніве культурнай. Толькі ахвярная праца, якой мы павінны аддацца ўсёю душою, кажа грам. Шырма, дасьць нам рэальныя вынікі. Трэба сабе ясна ўявіць, што значыць гэтае вялікае слова Родная Школа. Толькі праз родную школу, праз навуку ў роднай мове мы можам здабыць для сябе тыя падставы, якія дапамогуць нам выйсьці на сусьветны вялікі шлях народаў; чужая-ж школа патрабуе іншых высілкаў. Не павінны мы, кажа далей гр. Шырма, паддавацца ў крытычны момант, адчаю. Культурная справа ў агульным маштабе досіць значна пашыраецца. Часамі ёсьць запутаньні працы, гэта выясьняецца тым, што сябры недакладна ведаюць, на чым палягае плян працы; на гэта трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу. Брак інтэлегэнцыі ў даным выпадку балюча адчуваецца, але вялікія высілкі даюць вынікі прыёмныя. У гарачых словах грам. Шырма тлумачыў, на колькі важнае для нас і пазашкольнае пытаньне. Пасьля сусьветнай завірухі моладзь, выкінутая за парог школы, засталася здэмаралізаванай. Духовае падняцьце маладога пакаленьня, — галоўнае заданьне Т-ва. І ўва ўсім гэтым к нам ідзе з дапамогай, як верны наш жыцьцёвы сябра, кніжка. Заданьнем Т-ва Бел. Шк. — паглыбіць сьветапагляд. духовае разьвіцьцё ў людзей. Навука, кніжка ёсьць пэўным памоцнікам нам на гэтым адраджэнскім шляху да нашае сьвятое будучыні. Далей ў чарговым парадку адбыліся перавыбары Акружнай Управы, у склад якой ўвайшлі наступныя асобы: Міхась Косьцевіч, як старшыня, Надзея Ламашэвічанка—віцэ старшыней, сэкрэтар Язэп Шышлюк, яго заступнік М Кізевіч і скарбнік Піліп Кізевіч.

У бягучых справах, грам. Уласаў зазначыў аб неабходнасьці арганізаваньня ў Вільні дзесяцідзённых курсаў, для будучых інструктараў гурткоў Т-ва Бел. Школы, якія-б стараліся праводзіць у жыцьцё заданьні нашай культурна-асьветнай арганізацыі. Адначасна прамоўца падае да ведама аб маючай адбыцца ў Вільні ў м цы кастрычніку беларускай выстаўцы, заклікаючы сход прыняць чынны ўдзел у гэтым, прысыланьнем арыгіналаў, модэляў і розных рэчаў, якія ўжываюцца на беларускай вёсцы. На заканчэньне зьезду паліліся гукі песьні, створанай прачнуўшымся ад векавечнага рабскага сну Беларускім Народам:

„Ад веку мы спалі і нас разбудзілі“...

Прысутны сябра.

Праца Гурткоў Т-ва Белар. Школы.

× 8. VII. і 22. VII. с. г. Каранішчацкі Гурток Т-ва Бел. Школы, Вялейскага павету зладзіў у вёсцы Каранішчах спэктаклі.

8. VII было пастаўлена: „Сурдут і Сярмяга“—драма ў 3 актах Гутоўскага і „Пасланец“—Жарт у 1 акце Л. Родзевіча. 22. VII. было пастаўлена: „Апошняе Спатканьне“ — драма ў 4 актах. Ул. Галубка і дэклямацыя: „Будзь сьмелым“ — верш Я. Купалы, „Хто адрокся свайго“—верш Г. Леўчыка, „Гусі“—верш Я. Коласа.

Чысты даход ад абодвых спэктакляў пашоў на куль.-асьветныя мэты Т-ва Бел. Школы. Сакратар Гуртка Пл. Грышкевіч.

× Блудзенскім гуртком 27 траўня г. г. быў наладжаны спэктакль-вечарына. Былі адыграны дзьве п'есы: „Суд“ і „Боты“, і канцэрт Народу было да 200 асоб і ўсе былі задаволены. Спэктакль даў добрыя вынікі, часьць грошай пайшло на „страж агнёву“ — а рэшту адправілі ў рэдакцыю газэты і Маланкі — 10 зл. выдавецтву на выданьне новых п'ес і на 36 зл. выпісана новых кніг для бібліятэкі-чытальні.

Падзякі.

Гурток Т-ва Бел. Школы у м. Сьвіслачы, шчыра дзякуе за ахвяраваную для бібліятэкі ім. К. Каліноўскага кніжку і шле найлепшыя пажаданьні для прагрэсу Выдавецтва.

Мішуцкі Гурток Т-ва Бел. Школы гэтым складае шчырую падзяку грам. Мікалаю Кабаку, з в. Мішут, Войстамскае гміны, за ахвяраваньне ім на карысьць бібліятэкі-чытальні, існуючай пры Гуртку, 16 беларускіх кніжак, вартасьці разам 7 злотых.

Так-жа складаецца падзяка гр-ну Уладзімеру Харламу, за ахвяраваньне ім на карысьць бібліятэкі-чытальні — 50 гр.

Як бачым, дык і ў нашай „Войстамшчыне“—люднасьць зразумела нарэшце значэньне роднай кнігі і матар'яльна прыступае да помачы ў пашырэньні асьветы.

Управа Гуртка.

Абвестка.

Згубленыя дакумэнты

на імя Мікалая Шылы: Вайсковая кніжка, выданая Віленскім Р. К. U., пасьведчаньне Бакштанскай гміны, Буцлаўскае гімназіі, Барунскае сэмінарыі і інш.—уневажняюцца.

Хмарачкі.

Плывуць, лятуць
Хмарыначкі...
З мае бягуць
Краіначкі!

У даль нясуцца мілыя
Па небу лёгкакрылыя
И бурлівыя,
И шчасьлівыя
Па небу лятуць.

У вакне стаю,
Узіраюся
І пра сваю
Пытаюся
Старонку я каханую
Хмарынку сустраканую
І ветрам ганую,
Раскудланую
З бурамі ў баю.
Ой, хмарка ты
Каханая,
З-за Буга ты
Прыгнаная,
Скажы, як нашы маюцца,
З нядоляй ці змагаюцца?
Ці змагаюцца
Ня ўгінаюцца
За долю сваю?
І як-бы чуць:
„Трымаюцца!
Яны жывуць!
Змагаюцца,
Ня гнуцца!“... Так бурлівыя
Шапочуць, быццам, сівыя—
Хоць і маўклівыя,
Лёгкакрылыя
І лятуць, лятуць...

Каранова-Вастрог
17. VI. 28 г.

С. Сіняк.

Наша хроніка.

Незацьвярджаньне гр. С. Паўловіча? Як нас паведамляюць, Куратарыум не зацьвярдзіў гр. С. Паўловіча дырэктарам Віленскай Беларускай Гімназіі, на якую пасаду прадставіла яго Галоўная Управа Т-ва Беларускай школы. Але аб гэтым яшчэ брак дакладных ведамасьцяў.

„Спадар“ раджае „спадара“. Як паведамляе № 14 „Народу“—орган „Спадара“, „Беларускі Гаспадарскі і лепей (Спадарскі) Зьвяз“—вярней сам праслаўлены „Спадар“—„блажэнны“ др. Янка Станкевіч хіба-ж пад націскам „хлебадаўцаў“ — пастанавіў выдаваць новую беларускую гаспадарчую часопісь пад назовам „Беларускі Гаспадар“ (ці не памылка тут, мо' „Беларускі Спадар“?).

Вось будзе нашым сялянам!

Пэўна-ж не ў аднаго жывот забаліць ад спадароўскіх навучоных дзівосаў і сьмяхотаў і „ходаньня“ з красой і чыстатой беларускай мовы... на карысьць „карміцелькі“.

Адлажэньне камуністычнай справы. 2-га г. жніўня Акружны Суд у Вільні меўся разглядаць справу камуністычнай арганізацыі, складаўшайся (паводле прэсы) з 10 наступных чалавек: павадыра Пятра Цьвяткова, Хаіма Гэлева, Беньяміна Дордвяка, Саламона Шварца, Майсея Краўца, Пэйсаха Кэнігзбэрга, Юдаля Сэгаля, Абрама Хайта, Чэслава Пэрго і Марылі Адзінянкі.

Вымененым закідаецца праступства з 102 ар. II. ч. К. К., быўшае ў „сьціслай“ сувязі з КПЗБ.

З прычыны адсутнасьці галоўных сьведкаў абвіненьня, вядомых ў працэсе „Грамады“—Бабіча і Вышынскага, суд адложаны да паловы верасьня г. г.

Сэквэстрацыя без паквітаваньня. Як падае „Słowo“ з 29. VII. г. г., надовячы віленскія сэквэстратары забралі за залеглыя падаткі без адпаведнага пратаколу і паквітаваньня ўсе рэчы з памешканьня нейкага Ц. Каца, на Татарскай вуліцы.

Мусіць, віленскія сэквэстратары маюць так многа працы (сэквэстраваньня), што ў гарачкавым пасьпеху ня маюць часу на „залатвеньне“ фармальнасьцяў.

Пратаколы ў Вільні. Па статыстычных даных, у сёлетнім ліпні на абшарах Вільні паліцыя сьпісала 2100 адміністрацыйных пратаколаў...

Муляры дамагаюцца падбаўкі. Апошнімі днямі віленскія муляры зажадалі падбаўкі з 1,75 зл. на 2 зл. за гадзіну.

Дворнікі дасталі падбаўку. На доўгае дамаганьне падбаўкі, Надзвыч. Разьемчая Камісія пастанавіла павялічыць пэнсію віленскім дворнікам.

Падбаўка гар. работнікам. Гарадзкія работнікі Вільні атрымалі падбаўку платы з 4 злотых і 60 грош. да 5 злотых ў дзень.

Камуністычныя адозвы. Надовячы ля жалезнай дарогі на шляху Ігналіна—Сьвянцяны няведамыя „выврговцы“ вевесілі многа камуністычных адозваў, заклікаючых насельніцтва Зах. Беларусі да „антыдзяржаўнай дзеяльнасьці“.

Польскія ўлады наладзілі „энэргічнае“ (добра ведамае беларусам) сьледзтва.

(„Слово“ № 175).

Слонімская „ячэйка“. Як інфармуе прэса, апошнімі днямі ў Сурэвічах, Слонімскага павету, зьліквідавана камуністычная „ячэйка“, складаўшаяся з 8 чалавек. Усе яны арыштаваны за распаўсюджваньне анты-

дзяржаўнай агітацыі і пасаджаны ў Слонімскі вастрог.

У часе рэвізыі быццам знойдзены цэлы рад „materjału dowodowego“.

Што-ж, умеючы, на „крэсах“ усяго можна знайсьці, чаго толькі „ўгодна“...

Суд над камуністамі. Акружны Суд ў Беластоку засудзіў на год цяжкага вастрогу нейкага Кватэра і на 2 гады Сэндэра Казака. Абодвух за рэдакцыю і выданьне камуністычнай аднаднёўкі „Беластокер Арбэйтэр Лебен“ (Беласт. Работніцкае Жыцьцё).

Забастоўкі. У драўнянай фабрыцы Рудвікаў Ігналіне выбухла забастоўка.

Работнікі жадаюць павялічэньня платы ад 30 да 50 прац.

— Забастоўка ў фабрыцы паперу ў Кучкурышках пашыраецца і абхапіла ўжо ўсіх работнікаў, бо апошнімі днямі да бастуючых работнікаў, належачых да Праф. Саюзаў, далучыліся і неналежачыя да Праф. Саюзаў работнікі.

У сувязі з гэтым гаспадар фабрыкі запрапанаваў работнікам перагаворы. Работнікі жадаюць 15 прац. падбаўкі.

Як падае „Кур. Віл.“ № 175, апошнімі днямі бастуючыя работнікі не дапусьцілі да вывазу з фабрыкі гатовага матарыялу. Трэба спадзявацца, што тут не абыдзецца без „інтэрвэнцыяў“ (улады).

— Апошнімі днямі скончылася забастоўка пекароў у Вільні. Пекары дабіліся прызнаньня працадаўцамі высунутых імі варункаў зборнай умовы на 1928-29 год.

Сэквэстратарскія надужыцьці. У Даўгінаўскай воласьці выкрыты вялікія надужыцьці, сягаючыя некалькіх дзесяткаў тысяч злотых. Дэфраўдантамі зьяўляюцца граза беднага сялянства,—сэквэстратары: Бараноўскі, Ляховіч, Сямашка і памошнік пісара Карачун.

Адначасна выкрыты надужыцьці на суму 2,500 зл. былога войта Русецкага і цяперашняга пісара той-жа воласьці Белевіча.

Усе яны арыштаваны.

Ці ня дзіва гэта: мужыкі сядзяць за палітыку, а „панове“ за дэфраўдацыю!?

Літоўцы перашкаджаюць. Польская прэса падае, што папраўленьне некаторых вывернутых бурай польскіх слупаў на літоўскай граніцы стала напатыкаецца на „дражлівыя“ перашкоды літоўскіх шаўлісаў (стральцоў) ці навет і літоўскай пагранічнай варты.

Гэтыя частыя выпадкі адбываюцца пераважна ноччу.

Уночы літоўцы нішчаць або пераносяць польскія стаўпы ў глыб польскай тэрыторыі.

Нелегальны пераход граніцы. Як падае польская прэса, апошнімі днямі, на радавым пагранічччы, у раёне Івянца польскія ўлады затрымалі за нелегальны пераход граніцы 19 чалавек, у ліку якіх ёсьць некалькі камуністычных агітатараў.

Арышт камуністычных тэхнікаў. Надовячы на радава-польскім пагранічччы, у раёне Куцэвічаў польскія ўлады арыштавалі 3 камуністычных „тэхнікаў“, пры якіх, як ведама, знайдзены рад кампрамітуючых дакумантаў. („Кур. Віл.“ № 175).

Вялікая бура. У нядзелю 29 м. ліпня над Віленшчынай пранеслася вялікая бура з пярунамі, зрабіўшая найбольш шкоды ў Віленскім, Вялейскім і Пастаўскім павеце, у Сьвянцяншчыне і Ашмяншчыне значна менш. Як сьлед буры, асталося больш 1000 маргоў зьнішчанага збожжа і каля тысячы спаленых будынкаў і гаспадарак. Апрача гэтага, папсаваны цэлы рад тэлеграфічна-тэлефонічных ліній, дзякуючы чаму была перарвана тэлеграфная камунікацыя на шляху Вільня—Маладэчна. Адначасна на шляху Маладэчна—Вялейка. З людзкіх ахвяраў 11 забітых і 45 параненых пяруном.

Мусім адзначыць, што шкоды і страты, прычыненыя гэтай бурай, дакладна яшчэ няведамы.

КАРЭСПАНДЭНЦЫ.

Хоць з мужыцкага роду, але папаў на панскае крэсла.

(Вёска Трухановічы, Дзятлаўскай воласьці, Навагрудзкага павету).

Нядаўна прыехаў доктар з п. войтам і паліцыянтам і ў нашу вёску, паглядзець чыстаты і парадку. Як толькі ўехалі ў вёску, п. доктар з паліцыянтам пашлі раней пераглядаць студні, а п. войт, ідучы ззаду, папраўляць пакрывачкі на іх, а таксама крукі і мётлы. П. доктар з паліцыянтам прышлі да студні Сяргея Ганчара і ўсё, здавалася, было спраўна — пакрыўка пры студні і вядро было прыкована, толькі не перабіта зьверху і жэрдка была прывязана не ланцугом, а дротам, бо, ведама-ж, ланцуг грошы каштуе, а селяніну зарабіць няма дзе, а калі замазоляе які грош, то трэба хлеба купіць, каб пракарміць сябе і сям'ю. Але доктар з паліцыянтам не зьвярнулі на гэта ўвагі, паглядзелі і пашлі далей, а як прыйшоў пан войт, дык давай „папраўляць“. Пакрыўка, хоць і моцна была прыбіта, адарваў; вядро адарваў, ведама ўгадаваў сілу. Гр. Ганчар пачаў прасіць: „паночку, я ня меў за што купіць ланцуга“, а п. войт, як вызьвярыцца да яго. „А, пся крэв ваша! чэму у ват на гурткі то пенёндзы ест, камуністы вы, пся крэв ваша; вас тшэба ўчыць, як жыць“. Гр. Ганчар прасіўся: „паночку, я-ж не адзін, а нас многа бяруць ваду і я адзін буду купляць“. Так вазьмі — кажа пан войт — купі вшыстко і замкві студню, а як прыйдзе хто браць ваду, дык шыш яму выстаў. І паказаў яшчэ, як зрабіць, штось разоў са тры хвігаю пад самы нос Сяргею і прыгаварваючы: „вось вам вада“. Ведама-ж культурны чалавек, хоць хвігі — дык умее добра даваць і другіх вучыць, бо ён на гэта скончыў курс, мусіць, калі такі спрытны і яшчэ абзывае камуністымі і, прайшоўшы праз вёску, паламаў некалькі жэрдак, на каторых сядзелі крукі і мётлы і з гэтым і паехаў, нарабіўшы шкоды людзям, каторыя мусілі траціць час і грошы на дошкі і на жэрдкі і ўсё гэта спраўляць! Дык вось, браткі, які прыклад нам даў п. войт М. Прыбыткоўскі Дзятлаўскае гм. Ганьба табе, п. Міхале!

Т-разак.

Абдзірства.

(Навагрудзкі павет).

Ян Стравінскі з м. Мираўшчына, Дзятлаўскае вол., мае добрых лізуноў, верных служкаў — Мацея Івашку з бацькам, каторыя і днём і ноччу пільнуюць яго абшар, каб вясковая скаціна і каса не патачыла. 30 траўня, з в. Труханавіч гр. Мікалая Мялейкі кабыла сашла на папар гэтага п. Стравінскага, якую Івашка і забраў. Пайшоў Мялейка прасіць, каб п. Стравінскі аддаў кабылу — дык пан загадаў яму плаціць аж 10 зл. М. Мялейка ня меў чым заплаціць і, пачуўшы ад Яна Стравінскага, нячуваных слоў з пагрозаю, аставіўшы кабылу, пайшоў ні з чым да хаты. Пан жа, прадзяржаўшы кабылу цэлы дзень, выгнаў з двара, а на М. Мялейку напісаў пратакол і па пратаколе выззваў у суд. Гр. М. Мялейка паглядзеў, што справа кепска будзе, што ў судзе таксама на яго мала зьвернуць увагі і прыдзецца заплаціць у два разы даражэй—прымушаны быў мірыцца на 6 зл., бо-ж вядома, як багатаму — дык усюды рай і на небе, і на зямлі: яму ўсюды адчынены дзьверы, а бедных сялян і ў рай ня пускаюць і ў пеклі месца не даюць і так прыходзіцца бедным сялянам мучыцца, аж пакуль не грызяне яго гора і мука за сэрца і тагды ён скажа — „Годзі цяпер, калі бяда на шыі сядзіць“!

Той-самы.

Новы вучыцель.

(Горадня).

На тэрэне Горадні ёсьць тып пад імем Г. Злоцкі.

Прошласьць гэтае асобы цёмная, як тая вада ў ваблаках. Сам паходзіць з Скідэльскае гміны. Як перадае Фама — гэта „дзеяч“—быў у арміі Юдзеніча ў контрразьведцы, потым прымазаўся да эсэраў, а ў 1921 г. быў у Менску „чэкістам“, а, прыехаўшы ў Польшчу, стаў „вялікім дзеячам“ і навязаў кантакт з Савінковым. Служыў канфідэнтам у II аддзеле Ген. Штабу, а потым у Беластоцкай паліцыі, як „Бялоў-Немчыновіч“.

Уся яго работа зводзілася да таго, каб пісаць рознага гатунку даносы ў дэфэнзыву і правакаваць паасобных грамадзкіх работнікаў. Ен зьяўляўся галоўным сьведкам у Беластоцкім працэсе ў 1923 г. проці б. пасла С. Барана, на якога пісаў даносы ў дэфэнзыву і даў рэляцыі—нібы С. Баран, калі будзе незалежная Беларусь, будзе вызначаны Ваяводаю ў Горадні, і іншых розных правакатарскага зьместу заяў.

Цяпер гэты тып „за верную. службу“ быў камандзіраваны ў Кракаў на вучыцельскія курсы і ў хуткім часе будзе „kształcić“ нашу моладзь.

Трэба, каб кожны ведаў аб падобным тыпе.

Нядоля.

„Навука“ ў польскай школе.

(В. Лядкі, Ярэміцкая гм., Стаўпецкі пав.).

Як нашых дзетак „навучаюць“ „пазнанчыкі“, хіба ўсім ужо вядома, але не зашкодзіць яшчэ адзін абразок.

Наш польскі вучыцель вучыць ні папольску ні пабеларуску, а толькі конікі ляпіць ды пад ногу сьвістаць. Затое добра карае, засаджваючы на 4 — 5 сьвяточных дзён „do kozy“. Калі-ж дзіця ня прыйдзе да „школы“, дык бацьку караюць на 5 зл. штрафу або 1 — 2 дні адседкі.

Апроч таго, гэты вучыцель мае шмат „надужыцьцяў“ і „дэфраўдацыяў“, за што яго навет падавалі на суд, з якога, аднак, выйшаў „чыста“. Але нябось, няхай хто з нашых сярмяжнікаў пападзецца, то не пашкадуюць гадкоў 3 — 4, або навет і 12.

Дзядзька Габрусь.

Царкоўныя пастухі.

(В. Капачы, Палачанскай гм., Маладэчанскага павету).

З даўных часоў народ наш жыве бедна, дзеля таго, што зямлі маюць зусім мала, а сенажаці, можна сказаць, зусім няма, а калі ў каго ёсьць, дык такое балота, што траву ні коні ні каровы ня хочуць есьці.

Дык вось нашыя гаспадары ўжо некалькі гадоў як пачалі сеяць кармовыя травы, як канюшына, віка і г. д. Сёлета дык канюшына ўрадзіла добра, але захацелі ьтаі ёй пажывіцца: кожную ноч то ў таго, то у другога канюшына спасеная. Пастанавілі нашыя сяляне дапільнаваць. І каго, вы думаеце, злавілі? — Царкоўных пастухоў, увесь царкоўны „састаў“: Кастусь і Сяргей Сярэбранікі — сыны папа, Барыс Савіч — сын дзяка, Юрэвіч — царкоўны сторож, Янка Паўлоўскі — сын царкоўнага папячыцеля.

Вось і „не крадзі“ — запаведзь, з якой вы сабе робіце маску.

Ці мала вам даходу з парахфіі! Ці ня досыць лупіць мужыка!?

Парахвіянін.

Добры прыклад.

(в. Пастарыня, Косаўскага пав.).

У нашай вёсцы было вясельле. Як шмат дзе, так і ў нас. існуе абычай, па якому трэба браць паваротнае з дружыны па адной бутэльцы. Але нашыя ўзялі грашмі і аддалі іх на карысьць Народнага Дому ў вёсцы Сенькавічах.

Няхай гэта паслужыць прыкладам для ўсей моладзі, якая столькі грошай марнуе на гарэлку. З грамады па нітцы — голаму сарочка! Моладзь в. Сенькавіч шле шчырую падзяку за ахвяраваныя грошы.

Чэсьць Вам!

Сенькавец.

Пісьмы у Рэдакцыю.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Не адмоўце зьмясьціць у Вашай паважанай газэце гэтых некалькі слоў.

У адным з нумароў газэты „Виленскаго Утра“ зьявілася заметка, што як-бы я супольна з іншымі асобамі зьвяртаўся да гр. Вярнікоўскага, прапануючы яму быць старшынёй Беларускага Клюбу Інтэлігенцыі.

Гэтым катэгарычна сьцьвярджаю, што зьвяртацца да гр. Вярнікоўскага я ня мог з тае простае прычыны, што я да ніякага клюбу не належаў і не належу.

Апрача таго, уважаю, што праца грам. Вярнікоўскага ёсьць шкадлівая для беларускіх працоўных мас.

З пашанай **К. Крук.**
Радны м. Вільні.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Прашу зьмясьціць наступнае:

У вёсцы Драчылава, Кашалеўскае вол., Навагрудзкага пав., 24 ліпня г. г. лясьнікам Макарэвічам застрэлены Мікалай Салаўян у той час, як садзіўся на воз пры выезьдзе з надворку. На вясельле Салаўян быў пакліканы, як музыкант, а гэты „stróż“, як і заўсёды, старажыў выпіўку. Выстралы лясьнік даваў як быццам на „wiwat“, але некаторымі прысутнымі было заўважана, што адзін выстрал быў дан уверх, а два апошнія амаль ня ў упор, навет з выпадам. Цікава тое, што гэтак у Макарэвічу ўжо ня першы гэткі выпадак, а другі, калі ня трэці, бо, будучы яшчэ паліцыянтам, ён ў вёсцы Скавародкавічах забіў гэтак сама выстралам жанчыну напавал. І цяпер, сьпісалі адно пратакол і зноў ходзіць з рэвальвэрам на дзіва і страх усім людзям на свабодзе і ў ладатак дастаў перавод па службе за якіх небудзь вёрст 10.

Мусіць гэта затым, што яго хрышчоны бацька, надлесным Навагрудзкага лясьніцтва (бо бачыце ён са ўсяго сьвету, а хрысьціўся ўжо сталым чалавекам, як пераканаўся, чыя мацнейшая вера) або можа падзяка за што іншае, вядомае адно надлеснаму з братамі ды Макарэвічу? Салаўян быў у вёсцы шчырым і сьвядомым беларусам.

Прашу паважанага Рэдактара зьвярнуцца ў Белар. Пасольскі Клюб, каб зложылі інтэрпэляцыю

З пашанай брат забітага:
В. Салаўян.

Ад Рэдакцыі. Просьбу ў Беларускі Сялянска-Работніцкі Клюб перадалі, але цяпер інтэрпэляцыя ня можа быць зложана з прычыны роспуску на лета Сойму. Але гэтая справа без насьледкаў не астанецца.

Ад сябе Рэдакцыя зварочвае ўвагу чытачоў на няспыняючыся зьдзек і трэбуе ад адміністрацыі і суда строгай кары для віноўнага, бо дакуль-жа ўрэшце ўсё гэта будзе?

Да падпішчыкаў і чытачоў „МАЛАНКІ“.

Адміністрацыя часопісі „Маланка“ за пасярэдніцтвам нашай газэты паведамляе сваіх паважаных падпішчыкаў і чытачоў, што летні перарыў у выдаваньні „Маланкі“ скончыўся і рэдакцыя прыступіла да апрацоўкі № 8-га сваей часопісі, які ў хуткім часе выйдзе.

Перарыў быў вызваны галоўным чынам фінансавым крызісам, а таксама выездам некаторых супрацоўнікаў „Маланкі“ з Вільні.

Усім паважаным падпішчыкам, якія ў працягу мінулых чэрвеня і ліпня месяцаў не атрымалі належных ім нумароў „Маланкі“, адтрымаюць усе нумары, якія выйдуць у працягу жніўня і верасьня с. г.

Адначасна рэдакцыя прыпамінае тым неакуратным падпішчыкам „Маланкі“, якія, атрымаўшы рахункі рэдакцыі, да гэтай пары не прыслалі падпіснай платы, хай пасьпяшацца прыслаць доўг, чым памогуць рэдакцыі выбіцца з хранічнага фінансавага крызісу.

Адрэс: Рэдакцыя „Маланка“. Вільня, Гэтманская вул. № 2-4.

З Радавае Беларусі.

Ажыўленьне працы Радаў у БСРР.

„Kur. Wil.“ з 8 г. м. падае вестку з Менскай „Звезды“ аб ажыўленьні працы вясковых і раённых Радаў у БСРР — на падставе пастанаўленьня XI Зьезду Беларускай Камуністычнай Партыі. Ажыўленьне мае быць у сувязі з апіраньнем Радаў на дакладных бюджэтах.

„У Сібіры, піша „Kur. Wil.“ 25 процан. агульнага ліку вясковых Радаў мае свае ўласныя бюджэты, на паўночным Каўказе 42 проц.. а ў нямецкай рэспубліцы на Волзе праца ўсіх вясковых Радаў апіраецца на ўласным бюджэце. У Радавай-жа Беларусі толькі 4 проц. вясковых Радаў маюць уласныя бюджэты, што перашкаджае разьвіцьцю працы радаў і выклікае канешнасьць іх направы“.

Высяленьне былых земляўлаўласьнікаў з Беларусі ў Сыбір.

„Усходняе Агенства“ падае, быццам акцыя высяленьня былых земляўласьнікаў з тэрыторыі Радавай Беларусі ў Сыбір даходзіць канца. Усяго выслана ў Сыбір 640 сем'яў, у тым ліку 310 польскіх.

Усячына.

× Лодзкая работніца Станіслава Сэнк радзіла дзіця, зусім пазбаўленае галавы. Труп адданы ў Касу Хворых для перадачы ў паталягічную калекцыю.

× У Люблінщчыне ў вёсцы Людыч, у аднаго гаспадара карова прывяла цяля, маючае сабачую галаву, мызу і вушы. На пярэдніх лапатках вырастаюць нарасьці ў форме крыльляў. Заднія ногі—сьвіныя, хвост падобны да сабачага, пакрыты густой шэрсьцьцю.

Натуральна, што на гэтае дзіва прыходзіць падзівіцца шмат народу.

Паштовая скрынка.

П. Алейніку з Аргэнтыны. З найвялікшай ахвотай хацелі б скарыстаць Вашыя матар'ялы, але гэта пагражае канфіскатаю нашай газэце. Два нумары падрад былі канфіскованыя за артыкулы, у якіх мы хацелі выказаць наш пратэст над гэткай крыўдай усяго народу. — **Агню.** Вашыя карэспандэнцыі вельмі паляць цэнзарам, але за „Панскія рэформы“ можа не канфіскуюць. Апавяданьне што Вы калісь прыслалі да друку, не падыходзіць, верш пайшоў на разгляд у рэдакцыю новай часопісі. Спрабуйце пісаць фэльетоны — яны ў Вас будуць добра выходзіць, бо Вы з гэтага боку маеце здольнасьць. — **Сумуючаму, Немаўкліваму і Адважнаму.** З прысланага скарыстаем. — **С. Сіняку.** Вершы добрыя. Зважайце на разьмер і форму. Пішэце. Пераклады зьмесьцім у наступным нумары. Пішэце на адным боку паперы. — **В. Шкодзічу.** У вершах ухіляйцеся ад г. зв. дзеяслоўнай рымы (стаяць—стагнаць і г. д.); у Вашых вершах добрыя вобразы. Працуйце. Будзем, па магчымасьці, зьмяшчаць. — **Барысаглебскаму.** Прапуйце болей над вершамі. Ніякіх умоваў Рэдакцыя з паэтамі ня робіць. Кожны прысылае свае вершы, і што падыходзіць і на часе—пускаем. — **Пакрыўджанаму.** Вашае спраставаньне завельмі вялікае. Прасілі б надта прыслаць яго толькі абапёртым на факце.

Клецкая Белар. Гімназія

прырода-матэматычнага тыпу з прыгатав. клясай.

Дзеля таго, што прыймо новых вучняў у гімназію ўвосені можа адбыцца толькі з асобнага дазволу для кожнага вучня з боку Куратoрыума, Дырэкцыя Гімназіі прапануе ўсім бацьком і апякуном, якія маюць у надыходзячым 1928-29 шк. годзе паслаць сваіх дзяцей у Клецкую Беларускую Гімназію, падаваць у Дырэкцыю Гімназіі просьбы аб тым загадзя, найпазьней да **20-га жніўня**, каб Дырэкцыя мела час скіраваць іх у Кураторыум і да пачатку экзаменаў мела вымаганы дазвол.

Паданыя позна просьбы ня будуць уважаны і дзеці застануцца ня прынятымі ў Гімназію.

Да просьбаў трэба далучаць:

1. Мэтрыку аб нарадж. вучня, 2. Пасьведчаньне доктара аб стане здароўя і прышчэпе воспы, 3. Пасьведчаньне аб адукацыі, калі кандыдат да гэтага вучыўся ў якой школе.

Просьбы аб залічэньні дзяцей у прыгатаваўчую клясу будуць прыймацца да 1-га верасьня.

Пры гімназіі існуе інтэрнат для хлапцоў, а з пачаткам школьнага году мае быць арганізаваны **інтэрнат** і для дзяўчат.

Дырэкцыя Гімназіі.

Высылаючы рахункі, просім усіх нашых П. Гр. Падпішчыкаў у як найхутчэйшым часе ўрэгуляваць падпісную плату, каб ня змусіць нас спыніць высылку газэты.

Адміністрацыя.

Рэдактар-Выдавец: Язэп Машчоньскі.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.